Пралетарыі ўсіх краін, злучай.

Работніца і Калгасьніца
Беларусі

№ 22
1933 г.



З. БАНДАРЫНА

ЖАНЧЫНАМ АРАТЫМ

„У часе абгаварэньня пляну веснавой пасеўнай у калгасе імя Фрунзэ (Гарадоцкі сельсавет) жанчыны-калгасьніцы ўсіх трох брыгад абавязаліся: нароўні з мужчынамі выйсьці ў поле і працаваць па-ўдарнаму.

Сваё слова калгасьніцы стрымалі. Зараз за плугам працуюць 13 жанчын, працуюць добрасумленна".

(Чырвоная Полаччына).

1.

Схавалася сонейка
за барамі...
Ой ды з рану сонейка
з намі...
У сіняе вазёрца, зазірні,
плёскатым вясёлым пабудзіі

2.

Ой рана, рана...
Галіна арала...
На вайну забралі Яна.
На вайне забілі Яна.
Засталася ўдвох з сынам
сямігодкаю Максімам.
З плугам пазычаным,
конем пазычаным
на скарынку хлеба
зарабляці трэба.
А за коня з плугам
адрабляці трэба...
Ой рана, рана
Галіна арала...
Адна ў полі
былінкаю...
На паўзгорку
сіраціпкаю...
Вецер голас яе глушыць,
вецер сьлёзы яе сушыць.

3.

Прышла вясна,
дый вясьняначка,
бяссонная ночка,
вясновая дочка...
Ой ды ня сумуй, Галіна.
Ой ды не гадай, Галіна.
З адзінотай сябраваць даволі,
час табе разьвітацца з бядою,
Выйдзеш у поле,
выйдзеш у поле з грамадою.

4.

Зара-зарніца заірдзелася,
У возера сіняе заглядзелася...
Зара-зарніца пагубляла
ключыкі,
упалі росы-пэрліны на
жоўтыя люцікі...

т. Мухачова Марыля—брыгадзір паляводчай брыгады калгасу „Шлях Леніна", Быхаўскага раёну, прэміяваная ўдарніца.

Скавытаў у чарнобылі вецер на
ўзьмежку,
вясною за плугам ідзе Галіна
першай...
На палёх калгасных,
ураджайных нівах
засявае зерня весела,
шчасьліва.
Зара-зарніца пагубляла ключыкі,
Упалі росы-пэрліны на жоўтыя
люцікі.
І насеньне свае—абагуленае
і плугі свае—абагуленыя
і коні свае—абагуленыя!!
і машыны свае—не пазычаныя,
і сявалкі свае—не пазычаныя,
Усё—калгаснае,
сваё ўласнае!
Губляюцца зоры ў травах
на ўзьмежку,
З золакам на працу ідзе
Галінай першай.
Зара-зарніца заірдзелася
у возера сіняе заглядзелася.

5.

Прыйшла вясна
дый вясьняначка,
зорная ночка,
вясновая дочка...

6.

А я сонейка
перайму,
перайму...
Трэба брацца сёнечы
за сяўбу,
за сяўбу...
Шатамі зялёнымі
маняцца сасонкі,
па ўзгорку звонікам—
лілёвы сон...
Сочныя ды чорныя
леглі баразёнкі,
поле пад засеў
глыбака ўзаром...
А я сонейка
перайму,
перайму...
Трынаццаць плугоў,
трынаццаць жанчын
З імі Галіна брыгадзір.
Лепшых аратых, лепшых
ударніц
песьнямі, вершамі будуць
славіць.
А я сонейка
перайму,
перайму.
Пра калгасьніц Фрунзэ
напішу,
напішу...

Менск, 9-V—33 г.

Ц. Н. Б-ка Ср. Аз.

Работніца і Калгасьніца
БЕЛАРУСІ

Прлетары ўсіх краін, злучайцеся!

МАЙ 1933 г.
№ 22

Будуем сацыялізм за свой уласны пралетарскі кошт

„Партыя ведала, якім шляхам была пабудавана цяжкая індустрыя ў Англіі, Германіі, Амэрыцы. Яна ведала, што цяжкая індустрыя была пабудавана ў гэтых краінах або пры дапамозе буйных пазык, або шляхам аграбленьня іншых краін, або-ж і тым і другім шляхам адначасова.

Партыя ведала, што гэтыя шляхі зачынены для нашай краіны. На што-ж яна разьлічвала?

Яна разьлічвала на тое, што, маючы савецкую ўладу і апіраючыся на нацыяналізацыю зямлі, прамысловасьці, транспарту, банкаў, гандлю, мы можам праводзіць найстрэжэйшы рэжым эканоміі для таго, каб набываць патрэбныя сродкі, неабходныя для адбудаваньня і разьвіцьця цяжкай індустрыі.

Партыя проста гаварыла, што гэта справа патрабуе сур'ёзных ахвяр і што мы павінны пайсьці на гэтыя ахвяры адкрыта і сьвядома, калі жадаем дабіцца мэты.

Партыя разьлічвала падняць гэтую справу ўнутранымі сіламі нашай краіны, без рабскіх крэдытаў і пазык звонку". (Сталін).

„Для рабочага савецкая пазыка бяспройгрышная. Мы выігрываем на свае пазыкі новыя заводы з машынамі і культуру з дабрабытам—кажа Іван Аляксандравіч Дугін—токар па рамонце заводу б. АМО.

Рабочы Дугін мае рацыю—40 млн. чалавек, якія трымаюць савецкія дзяржаўныя пазыкі, і 30 млн. укладчыкаў у ашчадкасы на кожным кроку бачаць, на што ідуць іх грошы.

Новыя гіганты, новыя фабрыкі і заводы з перадавой тэхнікай, вялізарнае пашырэньне і перабсталяваньне старых, новыя інтэрнаты, сталоўкі, культурныя і дзіцячыя ўстановы, сацыялістычная перабудова сельскай гаспадаркі, узбраеньне яе новай перадавой тэхнікай, вялізарнае ўмацаваньне абароназдольнасьці нашай краіны—усё гэта пабудавана на свае пралетарскія сродкі, на свае ўласныя накапленьні.

Асноўнымі крыніцамі накапленьня былі: накапленьні аграмаджанай гаспадаркі, адлічэньні ў карысьць дзяржавы часткі даходаў ад узрастаючага таваразвароту краіны і мабілізацыя сродкаў насельніцтва, асабліва па лініі актыўнага ўдзелу працоўных у пазыках савецкай дзяржавы і ўкладах у ашчадкасы.

З 116 млрд. руб. капіталаўкладаньняў за 4 гады мабілізацыя сродкаў насельніцтва дала 21,6 млрд., або 18,6 проц., прычым у 1931 годзе—22 проц., у 1932 годзе—30 проц.

Гэтыя лічбы гавораць аб вялізарнейшым давер'і да савецкіх пазык, аб вялізарнейшым энтузіязьме працоўных мас, які выліўся ў дапамогу дзяржаве сродкамі.

Працоўныя нашай краіны добра разумеюць, што для індустрыялізацыі пралетарскай краіны няма тых крыніц фінансаваньня, якія ёсьць у капіталістычных краінах (пазыкі звонку, аграбленьне калёній). Мы можам разьлічваць толькі на ўнутраныя сілы нашай краіны „бяз рабскіх крэдытаў і пазык звонку".

Колькасьць пазыкатрымальнікаў у нашай краіне з кожным годам усё павялічваецца. У першай пазыцы індустрыялізацыі прымала ўдзел 6 млн. чалавек, у пазыцы „Чацьвертага завяршальнага году пяцігодкі"—40 млн. чалавек. Колькасьць пазыкатрымальнікаў павялічылася амаль у 7 раз, а сума рэалізацыі пазыкі ўзрасла ў 13 з лішкам раз.

Нашы пазыкатрымальнікі добра ведаюць і матар'яльную карысьць (выйгрышы, процанты) кожнага падпісчыка на пазыку. Так, у адным 1932 годзе выплачана выйгрышаў на суму 842 млн. руб.

Актыўны ўдзел у кампаніі рэалізацыі пазык прымаюць заўсёды дэлегацкія сходы.

Ідучы насустрач запатрабаваньням перадавых прадпрыемстваў, калгасьнікаў-ударнікаў, савецкі ўрад выпусьціў новую „Пазыку другой пяцігодкі" (выпуск першага году) на суму 3 млрд. руб. тэрмінам на 10 год з 1 кастрычніка 1933 году па 1 кастрычніка 1943 г.

Пазыка складаецца з двух выпускаў: процантнага (бяз выйгрышаў) і бяспройгрышнага.

Прыбытак па аблігацыях бяспройгрышнага выпуску пазыкі выплачваецца толькі выйгрышамі. За 10 год на кожную аблігацыю абавязкова выпадае адзін з выйгрышаў. У суму выйгрышу ўключаецца і кошт аблігацыі.

Па аблігацыях процантнага выпуску выплачваецца 10 проц. па купонах, якія будуць аплачвацца 1 раз у год, пачынаючы з 1 кастрычніка 1934 году.

На кожныя 100 руб., якія атрыманы дзяржавай пазыкай па бяспройгрышнаму выпуску, будзе выплачана па аблігацыях за 10 год 198 млн. руб.

Працоўныя жанчыны гораду і вёскі павінны прыняць самы актыўны ўдзел у рэалізацыі пазыкі. Кожны дэлегацкі сход павінен распрацаваць пытаньне аб пазыцы, павінен дапамагчы распаўсюджаньню пазыкі сярод працоўных гораду і вёскі асабліва сярод неарганізаваных жанчын па жактах, рабочых пасёлках, калгасах і вёсках. Шырока разгортваючы сацспаборніцтва паміж дэлегацкімі сходамі і падобнымі дэлегаткамі па лепшым распаўсюджваньні пазыкі, даб'ёмся найлепшых канкрэтных вынікаў. Дэлегаткі павінны папоўніць рады ўдарніц фінфронту, павінны растлумачыць шырокім масам працоўных жанчын, на што ідуць сродкі ад пазык, павінны дапамагчы кожнаму пазыкатрымальніку атрымаць усе свае даходы ад ранейшых аблігацый.

Ніводнай дэлегаткі, якая-б не дапамагала распаўсюджаньню пазыкі.

Ніводнай працоўнай жанчыны гораду і вёскі без пазыкі „Другой пяцігодкі".

Сваімі пралетарскімі сродкамі забясьпечым бесьперабойнае фінансаваньне нашага сацыялістычнага будаўніцтва!

БЫТАВЫЯ ЎСТАНОВЫ ПАСТАВІМ НА СЛУЖБУ ПАСЕЎНАЙ

„У мэтах лепшага ўцягненьня жанчын-калгасьніц у вытворчую працу калгасаў шляхам стварэньня ў калгасах бытавых устаноў, лічыць неабходным уключыць ва ўмовы правадзімага конкурсу сельсаветаў, як адну з важнейшых умоў, барацьбу саветаў за выкананьне задач па ўцягненьні жанчын у вытворчую працу і лепшую арганізацыю дзіцячых устаноў, ясьляй і пляцовак".

(З пастановы прэзыдыуму ЦВК БССР).

У калгасах БССР ідзе масавая сяўба, ужо ёсьць рад калгасаў, якія скончылі сяўбу („Кастрычніцкая рэвалюцыя"—Ратамскага сельсавету, Заслаўскага раёну і іншыя).

У БССР калгасы і саўгасы ў сваёй пераважнай большасьці маюць ільняна-бульбяны або жывёлагадоўчы ўхіл. Культуры ільну, канапель і бульбы як у пасеўны пэрыяд, так і ў часе догляду пасеваў і ўборкі ўраджаю патрабуюць рабочых жаночых рук, таму вялікае значэньне набывае правільнае і поўнае скарыстаньне жаночай рабочай сілы ў калгасах.

Каб поўнасьцю скарыстаць жаночую сілу, трэба вызваліць жанчын ад клопатаў дома і ад догляду дзяцей. Гэта можна зрабіць праз арганізацыю бытавых устаноў—сталовак, пральняў, ясьляй і пляцовак. Асаблівай увагі заслугоўваюць ясьлі і пляцоўкі, бо дзеці адбіраюць у маткі ўвесь яе працоўны дзень, калі іх няма на каго пакінуць.

Але, на жаль, ня ўсе кіраўнікі раённых арганізацый добра ўсьвядомілі сабе задачы, пастаўленыя партыяй па разгортваньні дзіцячых устаноў у часе палявых работ.

Агульная вынікавая лічба зводкі паказвае, што па 72 раёнах БССР плян арганізацыі ясьляй выкананы толькі на 50 проц. Гэты процант зусім незадавальняючы.

Цягнуцца ў хвасьце такія раёны як Стара-Дароскі, дзе замест 46 ясьляй адкрыты 12, Нараўлянскі на 25-IV замест 25—2. У такім-жа становішчы ясельная справа ў Тураўскім, Чырвонапольскім, Бялыніцкім, Лепельскім, Уваравіцкім, Плешчаніцкім, Брагінскім і Прапойскім раёнах. І невыпадкова, што ў большасьці з гэтых раёнаў вы мала знойдзеце жанчын на кіруючай працы ў якасьці брыгадзіраў, старшынь калгасаў, сельсаветаў і інш. Напрыклад, Тураўскі раён ня мае ніводнай жанчыны ні брыгадзіра, ні старшыні калгасу, ні старшыні сельсавету.

Чарапашымі тэмпамі ў галіне адчыненьня ясьляй цягнуцца раёны: Хойніцкі (плян 28, адкрыта на 1 мая—7), Лельчыцкі (з 34—16 на I-V), Магілеўскі (з 97—25 на I-V), Касьцюковіцкі (з 155—28 на 22-IV), Сураскі (з 46—10 на 25-IV), Вузьдзенскі (з 54—9 на 23-IV), Аршанскі (з 114—32), Бешанковіцкі (з 50—6), Бягомльскі (з 47—11 на 6-V), Лоеўскі (з 325—3 на 1-V).

Усе гэтыя лічбы сьведчаць, што ў радзе раёнаў ня выконваюцца дырэктывы партыі і ўраду ў галіне адчыненьня дзіцячых устаноў, што стварае пагрозу зрыву выкананьня ў тэрмін пасеўных плянаў.

У часе конкурсу на лепшы сельсавет па правядзеньні веснавой сяўбы трэба разгарнуць шырокую масавую работу вакол пытаньня адчыненьня і палепшаньня якасьці работы дзіцячых устаноў. Мабілізаваць на гэту справу калгасны жаночы актыў і дэлегатак. Толькі пры ўмове існаваньня дзіцячых устаноў мы зможам забясьпечыць стопроцантны выхад жанчын на працу, што ў сваю чаргу забясьпечыць выкананьне плянаў сяўбы ў тэрміны, указаныя партыяй і ўрадам.

Р—на.

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ АДЧЫНЕНЬНЕ ДЗІЦЯЧЫХ УСТАНОЎ У ТЭРМІН

Па Вузьдзенскім раёне на час летніх палявых работ будуць адкрыты 22 сталыя ясьлі па саўгасах і калгасах з ахопам 650 дзяцей, 33 сэзонных з ахопам 1.260 дзяцей, 39 пляцовак з ахопам 1.033 дзяцей, 10 прымітывак з ахопам 364 дзяцей і 2 ачагі з ахопам 75 дзяцей.

Для абслугоўваньня гэтай колькасьці дзіцячых устаноў падрыхтаваны новыя кадры працаўнікоў у ліку 55 чалавек.

Дзіцячыя ўстановы павінны былі быць адкрыты да 1-га мая, але гэтага няма. На 23-IV адкрыта толькі 9 ясьляй з плянавага заданьня ў 55.

Вялікім недахопам зьяўляецца слаба разгорнутая масава растлумачальная работа па саўгасах і калгасах. У выніку рад калгасаў і саўгасаў да вызначанага тэрміну не падрыхтавалі патрэбных для дзіцячых устаноў памяшканьняў і абсталяваньня, што затрымала адчыненьне ясьляй і пляцовак у вызначаны тэрмін.

Асабліва адсталі ў справе адчыненьня дзіцячых устаноў калгасы „Чырвоны ясень", Лашанскага сельсавету, „Чырвоны шлях" Стальбодзкага сельсавету, „Памяць Леніна", Цяпленскага сельсавету і іншыя.

Абавязак пасеўтроек пры сельсаветах і райана забясьпечыць сваячасовае адчыненьне дзіцячых устаноў, каб даць магчымасьць жанчынам прымаць удзел у калгаснай вытворчасьці.

Актывісткі-калгасьніцы і дэлегаткі павінны самі праявіць ініцыятыву ў справе адчыненьня дзіцячых устаноў, іх абсталяваньня і наладжаньня працы.

В. Жураўлёва.

Вузда.

Ад рэдакцыі. Часопіс чакае адказу ад праўленьняў калгасаў: „Чырвоны ясень"—Лашанскага сельсавету, „Чырвоны шлях"—Стальбодзкага сельсавету і „Памяць Леніна"—Цяпленскага сельсавету, што зроблена імі ў галіне адчыненьня дзіцячых устаноў.

ЗАБЯСЬПЕЧЫЛІ ВЕСНАВУЮ ПАСЕЎНУЮ ДЗІЦЯЧЫМІ ЎСТАНОВАМІ

Па Барысаўскім раёне на 23-IV выканана 74 проц. пляну па адчыненьні дзіцячых устаноў. Па пляне намечана адкрыць 75, а ёсьць 55. Такія сельсаветы, як Зембінскі і Вялікаленскі на 100 проц. выканалі пляны па адчыненьні ясьляў.

Там можна пачуць такія гутаркі сялянак-калгасьніц: „Цяжка нам было раней, дзеці былі бясьпрытульнымі, догляд ускладаўся на бабак, якія па старасьці не заўсёды маглі дагледзець дзяцей, і бывала так, што выбухне пажар ці каменем з рагаткі вока адзін другому выб'е. Бяда была для матак, а зараз зусім ня тое".

Другая жанчына падхапляе: „І ведаеце, бабачкі, кожнае дзіця мае сабе асобны ложачак і чыстую бялізну, як прыдзеш туды, аж сэрца б'ецца ад радасьці, што нашым кветачкам так добра. І калі ўспомню, што я сама калісьці была супроць арганізацыі ясьляй, то мне аж холадна становіцца. Як я магла быць супроць такога добра".

Па Зембінскім і Вялікаленскім сельсаветах усе калгасы маюць дзіцячыя ясьлі. Калі вы раніцою зьвернецеся хаця-б у адзін з калгасаў, то вам зараз кінецца ў вочы, што ўсе сялянкі-калгасьніцы—у брыгадзе, на полі.

У часе падрыхтоўчай працы да ясельнай кампаніі быў мабілізаваны ўвесь жаночы актыў. Райздраў наладзіў добры ўлік становішча ясельнай справы.

Але-ж ня гледзячы на шырока разгорнутую працу па арганізацыі дзіцячых ясьляй, у наяўнасьці яшчэ многа недахопаў.

Яшчэ ня ўсе калгасы маюць фонды харчаваньня для дзіцячых ясьляй. Ня ўсе ясьлі маюць аптэчкі і слаба забясьпечаны бялізнай. Райздраву неабходна будзе паставіць гэта пытаньне перад райсьнабам.

Нікіфарава.

ПРАВАЛІЛІ ЯСЕЛЬНУЮ КАМПАНІЮ

Практыка калгаснай працы ўжо ведае, якую вялікую ролю адыгрывае жаночая рабочая сіла ў калгасах. Добра сказаў аб гэтым наш правадыр тав. Сталін, што „трымаць гэту сілу пад спудам, значыць дапусьціць злачынства".

Вось гэта злачынства дапускаецца ў радзе калгасаў і сельсаветаў Чавускага раёну. Жаночая сіла ў гарачую пасеўную пару не скарыстоўваецца. Жанчыны сядзяць па хатах з дзецьмі, бо парт'ячэйкі, сельсаветы і самі праўленьні не паклапаціліся аб сваячасовым адчыненьні дзіцячых устаноў.

У радзе сельсаветаў раёну (Асінаўскім, Прылескім, Дзеднеўскім) на 4 мая ні ў адным калгасе няма ясьляй.

Возьмем калгасы „Сталінскі прыліў", „Іскра", Перамога", „Правда", „Чырвоная зорка", Асінаўскага сельсавету, якія ўжо даўно распачалі сяўбу. У гэтых калгасах з-за адсутнасьці ясьляй жанчыны ня выходзяць на работу.

Раённыя арганізацыі—райздраў і райана ня прымаюць ніякіх мер, каб ліквідаваць гэты прарыў.

Калгасьніцы калгасу „Чырвоная зорка", скончыўшы курсы загадчыц ясьляй, зьвярнуліся да старшыні Асінаўскага сельсавету Ярмоленкі з просьбай, каб ён дапамог у арганізацыі ясьляй, але Ярмоленка адказаў, што гэтаю справаю ён займайца ня будзе.

Малінская Адарка, таксама скончыўшая курсы, да гэтага часу не працуе, бо ясьляй у Асінаўскім сельсавеце няма.

РСІ павінна праверыць, як выконваюцца дырэктывы партыі і ўраду ў галіне адчыненьня дзіцячых устаноў у Чавускім раёне. Выявіць канкрэтных зрыўшчыкаў гэтай справы і ўказаць ім, што зрыў ясельнай кампаніі зьніжае тэмпы сяўбы і не забясьпечвае выкананьня пасеўных плянаў ў тэрмін.

Паваротны Мак.

Чавусы.

Райздраў, райза і жанорг забылі пра дзіцячыя ўстановы

Пэрсанальна ў Мсьціслаўскім РВК да 29-III ніхто за справу арганізацыі дзіцячых устаноў не адказваў.

Калі 29-III загадчык райза рабіў на пленуме РВК даклад аб падрыхтоўцы да сяўбы, то аб дзіцячых установах ёі толькі ўспомніў, але нічога не сказаў. У РВК ведаюць, што паводле плянавых заданьняў павінна быць 95 ясьляй і 50 нова-падрыхтаваных працаўнікоў. Як абстаіць справа на мясцох у калгасах і саўгасах з памяшканьнямі для ясьляй, з харчаваньнем і абсталяваньнем—у РВК ня ведаюць. Ня ведае пра гэта таксама і райздраў т. Кніга і жанорг т. Сухадольская.

Агіднае становішча з кадрамі для дзіцячых устаноў. З 45 жанчын, якія былі ў мінулым годзе падрыхтаваны на курсах для працы ў дзіцячых установах, ні адна не працавала. Вылучалі для працы ў ясьлі і на пляцоўкі каго папала. Так, у калгасе „Чырвоны дзень", Мазанаўскага сельсавету, у ясьлях, якія абслугоўвалі 40 чалавек, працавала шасьцідзесяцігадовая старая з крыжыкам на шыі. Дзеці спалі на агульных нарах, елі седзячы на падлозе. Такое-ж самае становішча з дзіцячымі ўстановамі было ў мінулым годзе і ў Пячэнкаўскім сельсавеце.

Зараз справай падрыхтоўкі дзіцячых устаноў, да веснавой сяўбы занялася РСІ. Чакаем, калі РСІ скажа сваё важкае слова па адрасе тых, хто пусьціў на самацёк адказную справу—забесьпячэньне пасеўнай бытавымі ўстановамі.

К—ва.

Выпуск курсаў ясельных працаўнікоў у Слуцку.

Плян па яслях выканалі

Падрыхтоўчая праца да адчыненьня дзіцячых устаноў па Чэрвеньскім раёне распачалася яшчэ задоўга да веснавой сяўбы. Работнікамі райасьветы і аховы здароўя былі зроблены выезды ня толькі ў сельсаветы, але і ў тыя калгасы, дзе меркавалася адкрыць гэтыя ўстановы. Са старшынямі калгасаў былі заключаны ўмовы на сваячасовую падрыхтоўку памяшканьняў для яслей і абсталяваньня. Праведзены 2-месячныя падрыхтоўчыя курсы для работнікаў дзіцячых устаноў.

Заданьне для Чэрвеньскага раёну—адкрыць 41 дзіцячую ўстанову (яслі, пляцоўкі), прычым з гэтага заданьня 75 проц. павінны працаваць у веснавую-пасеўную кампанію і рэшта — 25 проц. да ўборачнай кампаніі. РК КП(б)Б 22 красавіка заслухаў даклад аб ходзе падрыхтоўкі і адчыненьня дзіцячых устаноў. Праведзена пасяджэньне бытавой камісіі гарсавету, пасьля чаго ўсе члены гэтай камісіі выехалі ў сельсаветы, каб дапамагчы на месцы адчыненьню дзіцячых устаноў.

Вынікамі гэтай працы зьяўляецца тое, што з 41 установы на 1-V працуюць 33 установы.

Саўгас „Раванічы" яслі адкрыў 28-IV—33 г. З першага-ж дня было прынята каля 30 дзяцей. Яслі маюць свой уласны вялікі дом, з усіх бакоў акружаны дрэвамі, 4 вялікія, чыстыя, сьветлыя пакоі. Абслугоўваючы пэрсанал добра адносіцца да дзяцей і таму зусім ня чуваць плачу.

Дырэкцыя саўгасу добра ўсьвядоміла значэньне яслей і ўважліва адносіцца да ўсіх запатрабаваньняў загадчыцы, якая надта зацікаўлена гэтай справай.

Зусім інакш адносіцца да яслей старшыня „Першамайскага" калгасу Васькоў. Ён не ўсьвядоміў вялікага значэньня бытавых устаноў на вёсцы і, ня гледзячы на ўсе спрыяючыя ўмовы, ня хоча адкрываць яслей. „Добра ведаю пастановы партыі і ўраду ў гэтай галіне. Зараз нявыгодна адкрываць яслі, бо жанчыны сёньня яшчэ не працуюць і няма чаго дарма карміць дзяцей". Так разважае Васькоў.

Васькоў павінен ведаць, што гэтыя разважаньні зусім няправільныя. Калі жанчыны ў яго калгасе не працуюць, то гэта сьведчыць аб тым, што арганізацыя працы тут дрэнна пастаўлена.

Толькі сваячасовым адчыненьнем дзіцячых устаноў мы забясьпечым стопроцантны выхад жанчын у поле.

Іванова.

Падрыхтавалі 22 загадчыц

Лепшых калгасьніц вылучылі калгасы і сельсаветы раёну для працы ў яслях. Бо ня кожнай жанчыне даручыць матка сваё дзіця. 22 калгасьніцы паўтара месяца навучаліся на курсах і вярнуліся ў свае калгасы для абслугоўваньня веснавой пасеўнай.

Недаацанілі справу арганізацыі яслей такія сельсаветы, як Заронаўскі і Баранькаўскі. Яны ня прыслалі зусім людзей на курсы.

Сіроцінскі раён. **Анюта.**

Тав. Феськова—ударніца калгасу „10-ты зьезд саветаў БССР", Петрыкаўск. р.

Яслі не падрыхтавалі

У Крупскім раёне дзіцячыя ўстановы да сяўбы не падрыхтаваны. Паводле пляну павінна быць арганізавана 80 дзіцячых яслей, а на справе вялася падрыхтоўка да адчыненьня толькі 44. Абсталяваньнем забясьпечаны толькі 35.

У сельспажыўтаварыстве была добрая эмаляваная пасуда, яе купляў хто хацеў, а райздраў не здагадаўся забраніяваць патрэбную частку яе за дзіцячымі яслямі. У пляне ўказан тэрмін адчыненьня яслей да 25-IV—33 г. і ў гэтым-жа пляне намечан тэрмін для выпуску курсантак—загадчыц яслей 1-V—33 году. Цікава, як гэта думаў райздраў адкрываць яслі без загадчыц.

Раённыя кіруючыя арганізацыі здагадаліся паслаць 6 чалавек у сельсаветы спэцыяльна па адчыненьні яслей толькі ў часе разгорнутай масавай сяўбы. А дзе-ж яны былі раней? І ў выніку такой работы атрымалася, што калгасьніцы, якія маюць малых дзяцей, у часе сяўбы сядзяць па хатах.

Улік працы дзіцячых яслей вельмі абязьлічан — ні райздраў, ні райзна, ні райза ня ведаюць становішча арганізацыі яслей у калгасах.

Старшыня Крупскага сельсавету толькі на словах абавязваецца, што будуць яслі, але абсталяваньня і да гэтага часу няма.

Сельсаветы Крупскага раёну, уключыўшыся ў конкурс на лепшы сельсавет па правядзеньні веснавой сяўбы, павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на арганізацыю працы дзіцячых устаноў, каб ліквідаваць прарыў у гэтай галіне.

Н.

Арганізацыяй яслей і пляцовак у калгасах забясьпечым 100-процантны ўдзел калгасьніц у веснавой сяўбе, праполцы і ўборцы ўраджаю.

Уздымем ураджайнасьць сацыялістычных палёў, умацуем калгасы, зробім усіх калгасьнікаў заможнымі.

Дэлегаткі ў дап могу веснавой сяўбе

Работніцы і жонкі рабочых саўгасу „Старыца-Лапухі“ ўзялі на сябе канкрэтныя абавязкі па дапамозе пасеўнай — сабраць увесь попел з кватэр рабочых і служачых, захаваць яго ў сухім месцы. Уцягнуць усіх працаздольных жанчын у працу ў часе веснавых работы. Усе работы на грамадзкім агародзе, як апрацоўка глебы, пасадка, праполка, рабіць у нерабочы час. Зьнішчыць прагулы і спазьненьні, выконваць і перавыконваць нормы ня толькі па колькасьці, але і па якасьці.

Для ажыцьцяўленьня ўзятых абавязкаў дэлегацкі сход вылучыў брыгаду, якая сабрала ўвесь попел з кватэр рабочых. Усяго за дзень было сабрана больш за воз попелу.

Кожная дэлегатка ўзяла на сябе абавязак уцягнуць у вытворчасьць адну жонку рабочага. Сход дэлегатак таксама вылучыў брыгаду па праверцы санітарнага становішча рабочай сталоўкі і праверкі яе падрыхтаванасьці да веснавой сяўбы.

На лепшы ўдзел дэлегатак у веснавой сяўбе Старыцкі пункт выклікаў на сацспаборніцтва дэлегацкі сход вёскі Лапухі.

О. М.

Капыльскі раён.

Санітарыю — на службу пасеўнай

У калгасе „Савецкая Беларусь“, Маляцкага сельсавету, т. Багданава арганізавала гурток хуткай дапамогі і кіруе ім. Гурток працуе без перабояў. Усе калгасьнікі і калгасьніцы вельмі зацікаўлены гуртком.

Тав. Багданава паставіла перад сабой задачу—забясьпечыць усе вучасткі работ пасеўнай і убарачнай таварышамі, якія набудуць веды хуткай дапамогі, каб у выпадку чаго ня трэба было шукаць далёка фэльчара, а мець гэту дапамогу на месцы.

Прыклад Багданавай павінны падхапіць усе калгасы і арганізаваць гурткі хуткай дапамогі ў часе палявых работ.

Галя.

Крычаўскі раён.

Шэфы дапамаглі адрамантаваць інвэнтар

Фабрыка „Чырвоны тэкстыльшчык“ накіравала брыгаду рабочых і работніц у падшэфныя калгасы „Бязбожнік“ і „Авангард“, Пухавіцкага раёну, для праверкі падрыхтаванасьці да выезду ў поле.

Брыгада высьветліла, што інвэнтар не рамантуецца з-за адсутнасьці жалеза. Тады мы сабралі уціль, паслалі яго ў калгас, і інвэнтар быў адрамантаван. Разам з выяжджаючымі ў вёску быў накірован каваль, ён-жа дапамог у рамонце.

Брыгадай было выяўлена, што дысцыпліна ў калгасе слабая. Быў склікан сход калгасьнікаў і калгасьніц, на якім паставілі пытаньне аб узмацненьні працоўнай дысцыпліны. Пасьля гэтага мы бачым рэальныя вынікі—дысцыпліна ў калгасе наладзілася.

Турына.

Менск.

Работніцы ў падшэфным калгасе

Брыгада рабочых і работніц шклоўскай паняровай фабрыкі „Спартак“ праверыла падрыхтаванасьць падшэфнага калгасу „Чырвоная ніва“ да веснавой сяўбы.

У калгасе ёсьць свая кузьня, якая адрамантавала ўвесь інвэнтар і зрабіла яшчэ новых 17 калёс на жалезным хаду і некалькі боран. Акрамя гэтага кузьня адрамантавала інвэнтар суседняга калгасу.

Вольная.

Шклоў.

І-е мая на калгасным полі

Слаўнаўскі дэлегацкі пункт вылучыў брыгаду дэлегатак у калгас „XVI партзьезд“ для правядзеньня з калгасьніцамі 1-е мая.

Брыгада арганізавана вышла з калгасьніцамі ў поле. Ударна ўзяліся ўсе за працу і да трох гадзін дня выпрацавалі норму, нават перавыканалі яе.

Пасьля гэтага мы правялі сход калгасьніц. Абгаварыўшы пастановы ЦК КП(б)Б аб веснавой сяўбе, калгасьніцы абавязаліся з посьпехам скончыць раньнюю сяўбу, змагацца са шкоднікамі, рвачамі, прагульшчыкамі, быць першымі пачынальшчыцамі за павышэньне ўраджайнасьці палёў.

На гэтым сходзе 20 калгасьніц запісаліся на часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі“. Арганізован гурток па чытцы часопісі.

З жаночага сходу мы накіраваліся на мітынг калгасьнікаў, які адбыўся на полі. Не забылі мы агледзець і ясьлі, якія наведваюць 14 дзяцей.

Калгасьніцы былі вельмі задаволены работай брыгады. Прасілі часьцей наведваць іх. Нас пачаставалі добрым абедам і вячэрай. Так мы правялі з калгасьніцамі сьвята 1-е мая.

Маша.

Талачынскі раён.

Варожым выступленьням—рашучы адпор

На сходзе калгасьніц „Камунара“ і аднаасобніц вёскі Якаўлевічы абмяркоўвалася пытаньне аб адчыненьні ясьляй і дзіцячай пляцоўкі для забесьпячэньня стопроцантнага ўдзелу жанчын у веснавой сяўбе. Гэтага патрабавала большасьць жанчын, якія прысутнічалі на сходзе.

Аднак, знайшліся тут і такія як Жураўлёва Палагея і Захарава Насьця — аднаасобніцы, цьвёрдазаданьніцы, якія пачалі агітаваць жанчын супроць адчыненьня ясьляй і пляцоўкі, жадаючы гэтым падарваць працоўную дысцыпліну і пасьпяховае правядзеньне веснавых палявых работ. Выступленьням цьвёрдазаданьніц быў дан жорсткі адпор калгасьніцамі і аднаасобніцамі, якія абвясьцілі сябе мабілізаванымі на датэрміновае сканчэньне сяўбы ў тэрміны, вызначаныя партыяй і ўрадам. Тутжа на сходзе былі выбраны дэлегаткі.

Чарняўская Г.

Ворша.

ЛЕПШЫХ УДАРНІЦ—У КАНТРАЛЁРШЫ ЯКАСЬЦІ ВОРЫВА І СЯЎБЫ

Калгас „Прасьвет", Тарасаўскага сельсавету, па-бальшавіцку падрыхтаваўся да сяўбы і пачаў араць цаліну. Узарана 18 *га*, пасеяна раньнім аўсом 5 *га* і 2 *га* ячменем. Арганізаваны сталыя брыгады, да якіх прымацаваны вучасткі зямлі. Тры лепшыя ўдарніцы Кузькіна Таццяна, Палякова Каця і Раманкова Марыля вылучаны групаводамі.

У 8 гадзін раніцы ўсе калгасьніцы як адна чакаюць на калгасным дварэ работы. Групавод тав. Палякова Каця кажа, што сёлета добра будзе працаваць, ня прыдзецца хадзіць пад вокны шукаць жанчын, каб ішлі на работу, бо яны самі зараз зацікаўлены, каб хутчэй пасеяць.

У калгасе 60 рабочых коняй. Усе яны ў добрым стане. Вупраж і ўвесь сельскагаспадарчы інвэнтар прымацаваны да кожнай брыгады. Зусім ліквідавана абязьлічка. Кожныя тры дні выпускаецца брыгадная газэта, у якой вялікі ўдзел прымаюць калгасьніцы.

На сваім сходзе 17-IV калгасьніцы выклікалі на сацспаборніцтва калгас „Рашучы" па лепшым правядзеньні веснавой пасеўнай і ўборачнай кампаній.

На сходзе вылучылі лепшых з лепшых ударніц-калгасьніц тав. Ліцьвінаву Матрону і Клімаву Кацю кантралёрамі па праверцы якасьці ворыва глебы і сяўбы, а таксама сачыць за правядзеньнем мерапрыемстваў па павышэньні ўраджайнасьці.

Грумбіна.

Тарасаўскі сельсавет,
Веткаўскі раён.

КАНТРАЛЁРШЫ

— Жанкі, на сход, на сход—гукаў бадзёры голас цёткі Харыты. Жанчыны ўпраўляліся на гаспадарцы—хто варыў бульбу на вячэру, хто кароў даіў. Неўзабаве ўсе сабраліся. Дэлегаткі селі на пярэдняй лаўцы, а цётка Харыта (дэлегат усебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў) села за сталом разам з старшынёй калгасу.

Кожная хоча сесьці ўперадзе, каб пачуць, што скажа старшыня аб удзеле калгасьніц у пасеўнай кампаніі.

— Я на жанчын больш, як на ўсіх спадзяюся ў часе сяўбы—пачаў старшыня тав. Кіцура,—бо яны ў падрыхтоўцы да сяўбы паказалі сваю адданасьць.

І сапраўды жанчыны ў калгасе „Пралетары", асабліва дэлегаткі, працуюць на самых адказных працах. Працуюць непасрэдна ў палявых брыгадах.

У часе падрыхтоўкі да сяўбы па ініцыятыве дэлегатак сабрана 480 пудоў попелу. Дэлегаткі зграблі і зьвезьлі на поле ўвесь гной, раскіданы па вуліцы. Сабралі насеньне гародніны шляхам сацпазыкі ў саміх калгасьнікаў.

Брыгада ў складзе Ліцьвін Пелагеі, Кіцуры Мар'і і Харыты сабрала каля 4-х кгр. гароднага насеньня, $^1/_2$ пуда цыбулі.

Зараз у дзьвёх палявых брыгадах налічваецца 58 жанчын, з іх у першай брыгадзе—24, а ў другой—34. Брыгады разьбіты на групы, на чале якіх стаяць жанчыны Кацура Мар'я, Грышчэня Еўга, Дзямідзюк Харыта і Карасюк Надзя.

На разьбіўцы гною, пасадцы бульбы, карчаваньні і іншых працах—усюды калгасьніцы.

Зараз баявой задачай калгасьніцы паставілі—наладзіць кантроль за якасьцю ворыва і сяўбы. Дрэнна пасееш, дрэнны ўраджай атрымаеш.

Агрэхі ў мінулым годзе зьелі не малую частку калгаснага даходу і адбіліся на бюджэце калгасьніц. У гэтым годзе, каб гэтага ня было, калгасьніцы арганізавалі кантроль за якасьцю ворыва і сяўбы.

Сход калгасьніц пастанавіў арганізаваць брыгады кантралёршаў, якія абавязаліся асьвятляць ход сяўбы ў часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі", у раённым і цэнтральным друку. Кантралёршамі выбраны лепшыя ўдарніцы - калгасьніцы: Дзямідзюк Харыта, Грышчэня Еўга, Кіцура Мар'я, Яхно Мар'я, Ярмош Арына, Кацуба Ганна.

Вопыт арганізацыі брыгад кантралёршаў трэба пашырыць ва ўсіх калгасах Беларусі. Гэтыя брыгады дапамогуць выявіць недахопы працы і мабілізаваць масу калгасьнікаў і калгасьніц на іх зьнішчэньне.

К.

Жыткавіцкі раён.

Жанчыны-аратыя апраўдалі давер'е

Калгас „Юны ленінец", Закрынічнага сельсавету, выканаў баявое заданьне партыі і ўраду па раньняй сяўбе.

Да 25 красавіка калгас засеяў 20 гектараў аўса і 12 гектараў ячменю, перавыканаўшы плян аўса на 3 гектары. Жанчыны таксама ўцягнуты ў работу палявых брыгад. Тры ўдарніцы-калгасьніцы Гузова Каця, Дубоўская Поля і Пагунова Ганна атрымалі кожная па пары коняй. Яны сапраўды паказалі, што жанчыны здольны справіцца з гэтай галіной працы. Коні ў іх добра дагледжаны. Жанчыны-аратыя ўвесь час раньняй сяўбы перавыконвалі нормы.

Калгас „Юны ленінец" адзін з лепшых па выкананьні плянаў раньняй сяўбы ў раёне.

Т—а.

Чачэрскі раён.

Ударніцы пасеўнай

Калгасьніцы калгасу „Чырвоная зорка", Асінаўскага сельсавету, Чавускага раёну, у адзнаку сьвята 1 мая арганізавалі падворны абход па зборы насеньня гародніны.

У выніку жанчыны сабралі насеньня гародніны на 3 *га*.

Асабліва праявілі вялікую актыўнасьць ударніцы Малінская Дар'я, Круглікава Марфа.

Мак. Захарэнка.

Чавускі раён.

„Забясьпечыць правільную расстаноўку і поўнае скарыстаньне жаночай сілы ў калгасах у часе веснавой сяўбы, праполачнай і ўборачнай кампаніі“

(ЦК КП(б)Б і СНК БССР)

Вылячыць Кісялёва ад сьлепаты

На сходзе жанчын Кісялёў, кіраўнік дэлегацкага сходу калгасу „Чарацянка“, заявіў, што ў калгасе толькі дзьве ўдарніцы, якія працуюць на скотным дварэ, а ў палявых брыгадах ні аднэй ударніцы няма. Гэта паводле слоў Кісялёва, а як-жа на справе?

У калгасе 48 працаздольных жанчын, з іх на палявых работах (разьбіўка гною, пасадка бульбы) працуюць 43 жанчыны. Выхад жанчын на працу добры. Па-ўдарнаму працуюць Альвінская Камэля, Масло Алена, Кірбай Марыля.

Тав. Кісялёў ня ведае ўдарніц, ды адкуль яму іх ведаць, калі ён кіраўніком дэлегацкага сходу толькі лічыцца на паперы, а дэлегатак ніколі ня склікае і ніякай працы з імі не праводзіць. Сацспаборніцтва ў калгасе не разгорнута. Ёсьць добрасумленныя калгасьніцы, якія па-ўдарнаму працуюць, але іх ніхто не заўважвае, ня бачыць іх і Кісялёў.

Выхад жанчын на працу зрываецца з прычыны адсутнасьці ясьляй.

19 красавіка 7 жанчын ня вышлі на работу выключна таму, што не працуюць ясьлі.

Праўленьне калгасу „Чарацянка“ і асабіста старшыня калгасу тав. Кісялёў недаацэньваюць значэньня бытавых устаноў.

А.

Жыткавіцкі раён.

Ад рэдакцыі: Рэдакцыя часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі“ чакае адказу ад праўленьня калгасу і парт'ячэйкі, што зроблена ў калгасе „Чарацянка“ па разгортваньні палітыка-выхаваўчай работы сярод калгасьніц і па адчыненьні бытавых устаноў.

РАЎНЯЙЦЕСЯ ПА ПЕРАДАВІКОХ

Калгас „Чырвоны баец“ першым у раёне скончыў раньнюю сяўбу. Пасьпяховай сяўбе дапамагла правільная расстаноўка рабочай сілы ў брыгадах і разгорнутае сацспаборніцтва; калгас на 23-IV засеяў 20 *га* ячменю, выканаўшы плян раньніх на 100 проц.

Пры дапамозе вучняў жанчыны сабралі 2 тоны попелу.

У часе ворыва кожны араты сачыў за якасьцю яго. Быў выпадак, калі калгасьнік зрабіў агрэх, дык уся група аратых патрабавала ў брыгадзіра зьніжэньня яму на 20 проц. заробку. Праўленьне калгасу так і зрабіла.

Праддысцыпліна ў калгасе добрая. Прагулаў няма, спазьненьняў на працу таксама няма, ясьлі адкрыты.

Калгас „Чырвоны баец“ мае ўсе ўмовы выканаць плян засеву яравога кліну поўнасьцю і ў тэрмін.

Н.

Веткаўскі раён.

УСІМ КАЛГАСАМ І САЎГАСАМ—ЯСЬЛІ

Дзяржынскі РВК узяў цьвёрды курс—у 1933 годзе мець у кожным калгасе і саўгасе ясьлі. Гэта значыць адкрыць 95 калгасных і 10 саўгасных ясьляй.

У 90 калгасах ужо створаны фонды харчаваньня, у астатніх 5 калгасах зараз праводзіцца работа па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў у самім калгасьнікаў для складаньня харчовага фонду.

В. К.

Дзяржынскі раён.

Карнова Ганна—ударніца калгасу „Шлях Леніна“, Быхаўскага р-ну.

ПЕРАВЫКОНВАЮЦЬ НОРМЫ

Добра працуюць жанчыны ў калгасе „Чырвоны агароднік“ і асабліва гародняя брыгада, якая налічвае 20 чалавек калгасьніц. Брыгада ўжо амаль скончыла сяўбу гародніны. Засадзілі 2 *га* цыбуляй, 0,5 *га* буракамі і засеялі 3 *га* морквай. Лепшыя ўдарніцы гэтай брыгады Серада Зіна і Сухаміра Таня выпрацоўвалі па 2½ працадні ў дзень.

Добра працуе на парнікох Кісялевіч, якая заўсёды нормы па перасадцы рассады перавыконвае. Норма—перасадзіць 1½ рамы, а яна перасаджвала па 2,5 рамы. Іншыя калгасьніцы калгасу „Чырвоны агароднік“ павінны раўняцца па лепшых ударніцах.

Г.

Петрыкаўскі раён.

БАРОЎСКАЯ ПАРАСКА—АКТЫЎНЫ ЗМАГАР НА ФРОНЦЕ ПАСЕЎНАЙ

Дэлегатка раённага і ўсебеларускага зьезду Бароўская Параска з калгасу „Чырвоная кветка“, Рацукоўскага сельсавету, Вузьдзенскага раёну, ня гледзячы на пажылыя гады, гарыць энтузіязмам і творчай энэргіяй, якую цалкам аддае на калгаснае будаўніцтва. Параска лепшая ўдарніца ў калгасе і актыўная грамадзкая працаўніца. Яна ў сваім калгасе сумесна з праўленьнем правяла шырокую растлумачальную работу аб шкоднасьці рэлігіі і ў дзень кулацкага сьвята—вялікадню першай вышла на поле сеяць бульбу. Разам з ёю вышлі ўсе жанчыны і мужчыны з першай брыгады. Вышаў нават 80-цігадовы Каржанец.

Шмыгіна А.

Вузьдзенскі раён.

Тт. калгасьніцы і працоўныя сялянкі, пішэце, як у вашым калгасе прайшла сяўба, пішэце аб лепшых ударніцах, каб іх вопыт працы перадаць іншым.

Разгарнуць палітмасавую работу сярод тарфяніц

Задача ператварэння БССР у тарфяны Данбас патрабуе ад партыйных, прафсыянальных і савецкіх арганізацый асаблівай увагі сваячасовай і найлепшай падрыхтоўцы да сустрэчы тарфянога сэзону.

Большую частку рабочай сілы на торфараспрацоўках складаюць тарфяніцы, у масе сваёй прышоўшыя з вёскі (калгасьніцы і аднаасобніцы); сярод якіх ёсьць яшчэ і адсталыя настроі.

У БССР сярод 10.000 рабочых тарфянікаў ёсьць 5.800 жанчын. Гэта абавязвае партыйныя і прафсыянальныя арганізацыі зараз-жа разгарнуць такую палітыка-масавую работу сярод тарфяніц, якая-б забясьпечыла мабілізацыю іх вытворчай актыўнасьці на поўнае і сваячасовае выкананьне пляну торфаздабычы бягучага году.

Праверанай і апраўдаўшай сябе формай масавай работы сярод жанчын зьяўляюцца дэлегацкія сходы, якія і неабходна арганізаваць на кожным тарфяным балоце, вучастку ў пачатку сэзону.

Не павінна быць ні аднаго агрэгату, брыгады, рамы, дзе-б ня было дэлегаткі. Гэта неабходна ўлічыць партарганізацыям пры правядзеньні перавыбараў дэлегатак.

Як перавыбары, так і штодзенную работу дэлегацкіх сходаў неабходна забясьпечыць партыйным кіраўніцтвам.

Партарганізацыі павінны вылучаць кіраўнікоў дэлегацкіх сходаў з найбольш палітычна-падрыхтаваных таварышоў, замацаваўшы іх на ўвесь пэрыяд сэзону.

Задача агітмасаў рэгулярна праводзіць інструкцыйныя нарады ячэйковых жанарганізатараў і кіраўнікоў дэлегацкіх сходаў.

На кожным тарфяным балоце і на ўсіх буйных тарфяных вучастках неабходна вылучыць на ўвесь тарфяны сэзон спэцыяльных жанарганізатараў па партыйнай і прафсыянальнай лініі.

Праца дэлегацкіх сходаў павінна праводзіцца па раней складзенаму рабочаму пляну.

З дэлегаткамі-тарфяніцамі неабходна ў бліжэйшы час абгаварыць пытаньне аб значэньні тарфяной гаспадаркі ў справе забесьпячэньня энэргетычнай базы прамысловасьці, кантрольныя лічбы торфаздабычы па СССР, краю, раёну, балоту.

Дэлегаткі павінны добра распрацаваць нормы выпрацоўкі, уявіць значэньне барацьбы за якасныя паказальнікі, за аўладаньне тэхнікай сваёй справы, за ўмацаваньне працоўнай дысцыпліны, ахову сацыялістычнай маемасьці, за паляпшэньне якасьці бытавых умоў тарфянікаў і тарфяніц.

З дэлегаткамі неабходна таксама распрацаваць пытаньне аб нашых задачах у справе ўмацаваньня калгасаў, аб задачах шэфскай работы ў калгасах.

Работу з дэлегаткамі трэба арганізаваць так, каб ня толькі распрацоўваць тыя ці іншыя пытаньні, але і прыцягнуць дэлегатак да іх практычнага выкананьня. Арганізацыяй спэцыяльных брыгад грамадзкага кантролю над работай сталоўкі, каапэрацыі, дзіцячых устаноў прыцягнем дэлегатак да актыўнай, канкрэтнай працы. Мабілізуем іх на рашучую барацьбу з лодырамі, прагульшчыкамі, са зладзействам, безгаспадарчасьцю, за беражлівыя адносіны да мэханізмаў, да прадуктаў, матар'ялаў, да бытавога абсталяваньня. Прыцягнем іх да работы сэкцый саветаў, да работы прафсыянальных, каапэрацыйных і іншых арганізацый тарфяных вучасткаў.

Праз шырока разгорнутую палітычна-масавую работу сярод дэлегатак дабіемся ахопу сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам усёй масы тарфяніц.

Ні адна дэлегатка не павінна быць па-за радамі спаборнічаючых. Дэлегаткі павінны стаць пачынальніцамі новых форм працы, арганізацыі ўдарных брыгад, барацьбы за якасныя і колькасныя паказальнікі выкананьня пляну торфаздабычы.

Неабходна шырока разгарнуць работу сярод тарфяніц у бараках, вылучыўшы для гэтага барачных жаноргаў з партыйцаў і камсамольцаў у асобных выпадках даручаючы гэту работу і лепшым тарфяніцам-ударніцам. У бараках праводзіць гутаркі па чарговых палітычных і гаспадарчых пытаньнях, гучныя чыткі газэт і часопісяй, асабліва часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі". Арганізаваць калектыўнае слуханьне радыё. Мабілізаваць тарфяніц на барацьбу за культурны, чысты барак, супроць п'янства, хуліганства, картачных гульняў і іншых агідных зьявішч, якія яшчэ назіраліся на тарфяных вучастках у мінулым годзе.

Пры бараках і дэлегацкіх сходах неабходна з самага пачатку сэзону арганізаваць ячэйкі чырвонага крыжу, якія павінны адыграць вялікую ролю ў барацьбе за санітарнае становішча барака.

Неабходна таксама дабіцца пагалоўнага ахопу вучобай усіх няпісьменных тарфяніц, прыцягваючы да работы культармейцамі ўвесь пісьменны жаночы актыў.

Вялікую ўвагу неабходна аддаць рабоце сярод нацменшасьцяй, праводзячы з імі работу на роднай мове, забясьпечыўшы іх літаратурай і лікпунктамі.

Інтэрнацыянальнае выхаваньне работніц-тарфяніц павінна заняць вялікае месца ў палітмасавай рабоце.

Праз шырока разгорнутую партмасавую работу дабіемся выкананьня пляну торфараспрацовак.

Работніцы-тарфяніцы! Пішэце, як у вас разгортваецца масавая работа сярод жанчын, як падрыхтаваны бытавыя ўстановы для абслугоўваньня тарфяніц

Торфсэзон пачаўся

Качкі ды гусі сотнямі год гаспадарылі на неасяжных прасторах Асінаўскага балота. Балотная дрыгва была недаступна для чалавека.

Прыкладна з 1924 году, асабліва ў летні час, балота пачалі часта наведваць нейкія „невядомыя" людзі. Пасьля доўгіх і цяжкіх паходаў па балоце з дзесяткамі аркушоў розных чарцяжоў і запісаў адны з іх пакідалі балота. На зьмену прыяжджалі другія. Хто яны—гэтыя людзі? Яны—прадстаўнікі савецкай навукі — навукова-дасьледчыя экспэдыцыі. Іх цікавілі багацьці Асінаўскага балота, таму яны так часта пачалі яго наведваць. Аб гэтых багацьцях варта сказаць. Поклады таннага тарфянога апалу на балоце вымяраюцца сотнямі мільёнаў тон. Вынік работы навукова-дасьледчых экспэдыцый—5 тысяч гектараў дасьледванага балота. Ня меншая плошча засталася яшчэ не дасьледванай. Па грубых меркаваньнях навукова-дасьледчых сіл торфянога апалу для Белдрэс на Асінаўскім балоце хопіць больш як на паўсотні год.

Зьмяніўся зараз твар Асінаўскага балота. Яго называюць цяпер тарфяным Данбасам БССР. Фрэзэрны і машынафармовачны торф Асінаўскага балота пераўтвараецца Белдрэсам у электрычную энэргію, якая прыводзіць у рух машыны і варштаты прадпрыемстваў раду прамысловых цэнтраў (Віцебск, Магілеў, Ворша, Дуброўна і інш.).

З году ў год балота ўзбагачаецца новымі торф-машынамі і мэханізмамі. Цяжкая ручная здабыча торфу заменена мэханізаванай. У сэзон гэтага году на здабычы машына-фармовачнага торфу на Асінторфе будзе працаваць 18 элеватарных, або фармовачных машын. 26 трактараў будуць заняты здабычай фрэзэрнага торфу.

На аснове мэханізацыі вытворчых працэсаў з кожным годам сярод рабочых тарфянікаў узрастае лік тарфяніц. У гэтым годзе напрыклад торфа-здабычай на Асінторфе будуць заняты 3470 рабочых, каля паловы гэтай колькасьці—1396 чалавек складаюць жанчыны, што ў процантным ліку дае 40,3 проц. Яны прышлі на завод з калгасаў і аднаасобных гаспадарак. І задача кіруючых арганізацый Асінторфу заключалася іменна ў тым, каб добра сустрэць іх, стварыць для тарфяніц належныя бытавыя ўмовы. Гэтым асінторфаўцы, на жаль, пахваліцца ня могуць.

Торфсэзон пачаўся. Між тым важнейшы вагар барацьбы за прамфінплян — рабочае снабжэньне—застаецца самым вузкім месцам работы. На заводзе нават не хапае асноўных відаў прадуктаў для грамадзкага харчаваньня — капусты, бульбы. З гэтай прычыны якасьць абедаў усім нездавальняючая.

Самазагатоўкамі, якія-б далі магчымасьць палепшыць грамадзкае харчаваньне на заводзе, ніхто не займаецца і нарад на загатоўку 60 тон бульбы для сталовак заводу даволі доўгі час ляжаў у старшыні праўленьня ТРК тав. Салаўя, якога такая „дробязь" як бульба зусім мала цікавіць. Пры заводзе ёсьць прыгарадная гаспадарка, але яна ня зроблена яшчэ сапраўднай харчовай базай. У гэтым годзе да сяўбы прыгараднай гаспадаркі не падрыхтаваліся, не хапае значнай часткі насеньня, 15 тон раньняй бульбы, 10 тон позьняй, 1,5 тон аўса і на 42 *га* гародніх культур.

Заводзкія сталоўкі сустрэлі сэзон зусім непадрыхтаванымі. Катлы ні ў адной сталоўцы не палуджаны. Не хапае значнай колькасьці абсталяваньня і начыньня. Не хапае каля 50 чалавек абслугоўваючага пэрсаналу.

На пасёлку № 8 павінна была пачаць ужо работу новая сталоўка, але яе толькі пачалі будаваць, работы па будаўніцтве выкананы толькі на 31 проц.

Рабочыя тарфянікі і тарфяніцы не забясьпечаны поўнасьцю жыльлёвымі памяшканьнямі. Маруднасьць будаўніцтва тлумачыцца тым, што аддзел снабжэньня заводу на чале з загадчыкам тав. Чарнецкім не патурбаваўся сваячасова забясьпечыць аб'екты будаўніцтва будаўнічымі матар'ямі (леса-матар'ял, цэгла і інш.).

Недахоп жыльлёвых памяшканьняў прывёў да таго, што баракі перапоўнены. У невялічкіх пакоях, дзе можна зьмясьціць 3—4 чалавек, зьмяшчаюцца 6—7 чалавек. Ва многіх бараках, дзе жывуць жанчыны, усялена і значная частка мужчын.

Некалькі слоў аб бытавым абслугоўваньні жанчын-тарфяніц. Многія з ліку завербаваных жанчын прыяжджаюць на завод з дзецьмі. Ня мала дзяцей ёсьць і ў пастаянных рабочых заводу. Пры бесьперабойнай рабоце ясьляй жонкі гэтых рабочых маглі-б працаваць на торфараспрацоўках, і гэта было б добра, бо на заводзе адчуваецца значны недахоп рабочых і плян вярбоўкі рабочай сілы выканан ня больш як на 65 проц.

Між тым пытаньне работы ясьляй яшчэ і да сёнешняга дня канчаткова ня вырашана. Ніхто ўпэўнена ня можа яшчэ сказаць, колькі-ж дзяцей будзе ахоплена дзіцячымі пляцоўкамі.

Пытаньнем бытавога абслугоўваньня жанчын перш за ўсё павінен быў займацца сацыяльна-бытавы сэктар тарфкому, на чале з загадчыкам тав. Лазаравай. Аднак, гэты сэктар займаецца чым угодна, толькі ня пытаньнямі паляпшэньня бытавых умоў тарфянікаў і тарфяніц.

Ніякай культмасавай работы сярод тарфяніц не праводзіцца. Ва ўмовах такога буйнага заводу, як Асінторф, няма нават жанпрацаўніка, ня кажучы ўжо аб групавых жанарганізатарах. Адсюль як вынік—дэлегацкі сход на заводзе лічыцца толькі на паперы. Партыйная арганізацыя заводу, якая налічвае ў сваім складзе каля 50 членаў і кандыдатаў партыі, і камсамольская, якая яднае каля 70 камсамольцаў, ня сталі на чале культмасавай работы сярод тарфяніц і не разгарнулі яе.

Торфсэзон пачаўся. Каб поўнасьцю асвоіць праграму сэзону гэтага году, партыйная, камсамольская і прафсаюзная арганізацыі Асінторфу абавязаны аддаць максымум увагі рабоце сярод жанчын. Першачарговая задача — вырашыць пытаньне з жыльлём, сталоўкамі, дзіцячымі ясьлямі і пляцоўкамі, дабіцца таго, каб у самы бліжэйшы час яны пачалі сваю дзейнасьць. Неабходна вылучыць жанарганізатараў і аднавіць работу дэлегацкіх сходаў.

М. Нікіцін.

Актыўным удзелам работніц і жонак рабочых у прыгараднай гаспадарцы забясьпечым сваячасовае сканчэньне сяўбы

Жонкі рабочых—у дапамогу прыгараднай гаспадарцы

„Бульба ў капцох замокла, патрэбна дапамога"—маланкай пранеслася чутка па пасёлку.

„Дапамога"—адгукнулася рэхам у рабочых кварталах фабрыкі.

Жанорг тав. Чалоўская з дапамогай т. т. Гарчанскай і Расянковай хадзілі з кватэры ў кватэру, склікалі жонак рабочых на сход:

„Нясі дзяцей у ясьлі і абавязкова прыходзь на сход а 8 гадзіне—важныя пытаньні"...

Памяшканьне фабкому запаўнялася жанчынамі. Прышло таксама шмат работніц першай і другой зьмены. Распачалі сход.

Кароткую інфармацыю зрабіў старшыня фабкому.

— Сёньня выявілася, што бульба пачала ў капцох псавацца, трэба зараз-жа арганізаваць выбарку бульбы і перавозку яе ў сухое месца, бо калі мы гэтага ня зробім, ня будзе чым сеяць, а гэта значыць, што на фабрыцы сарвецца снабжэньне сталоўкі. Плаціць за працу будзем увосень натурай, а гэтыя дні будуць запісаны ў працоўныя кніжкі, якія будуць выданы на рукі.

Першае слова бярэ работніца Шудзейка. Яна запісваецца першай на выбарку і перавозку бульбы. У гэты час яшчэ больш падыйшло жанчын. На сход прышла нават 70-гадовая Журомская.

Адна за другой работніцы і жонкі рабочых бяруць слова, абвяшчаюць сябе мабілізаванымі на час выбаркі і перавозкі бульбы з капцоў. Жонка рабочага Зіманава выклікала на сацспаборніцтва Блахоціну на час выбаркі бульбы. Блахоціна выклікала Папкову. Тая запісваецца і выклікае Тарасаву Мар'ю, каб яна ўзяла з яе прыклад.

Праз некалькі хвілін усе жанчыны на сходзе абвясьцілі сябе ўдарніцамі па выбарцы і перавозцы з капцоў бульбы.

На заўтра пасьля сходу, раней пачалі працаваць ясьлі і прыгараднай гаспадаркі разьбіваць гной, а потым узяліся сеяць бульбу. Працавалі сапраўды па-ударнаму, пасьпявалі за 6 коньмі, засеялі тры *га* бульбай.

Пры разьмеркаваньні ўраджайнасьці трэба будзе забясьпечыць у першую чаргу лепшых ударніц, якія праявілі сябе ў цэху і на полі ў прыгараднай гаспадарцы.

Работніца.

г. Шклоў.

Ударніцы на прыгараднай гаспадарцы

Работніцы паккамэрнага цэху ф-кі „Спартак" ня толькі пасапраўднаму змагаюцца за выкананьне прамфінпляну ў цэху, але па-ўдарнаму прымаюць удзел у веснавой сяўбе ў прыгараднай гаспадарцы.

У выхадны дзень—30-га красавіка—13 работніц вышлі ў поле

Тав. Нікіціна—жонка рабочага-чыгуначніка (Віцебск), актывістка па каапэрацыйнай рабоце.

Бытавое абслугоўваньне работніц—вузкае месца

На Шклоўскай папяровай фабрыцы „Спартак" працуе каля 300 работніц, але масавая работа разгорнута слаба.

Дэлегацкія пункты работніц нічога ня робяць, працуе толькі дэлегацкі сход жонак рабочых. У парткалектыве няма ніякага ўліку дэлегатак, бо сьпіс згублен.

На фабрыцы ёсьць 66 лепшых ударніц, якія сапраўды па-бальшавіцку змагаюцца за выкананьне прамфінпляну. 30 работніц наведвае тэхгурткі. Прагулы работніц па няўважлівых прычынах зусім ліквідаваны.

Вузкае месца—гэта бытавое абслугоўваньне работніц. У хлебным ларку і сталоўцы вялікія чаргі. Калі хочаш паабедаць, калі хочаш купіць хлеб, дык не шкадуй некалькі гадзін. Вядома, гэта вельмі абурае работніц, бо за гэты час можна прачытаць газэту, заняцца вучобай. Праўленьне ЗРК нічога ня робіць, каб ліквідаваць чаргі.

ЗРК мала забясьпечвае работніц прамтаварамі. Таксама дрэнна снабжэньне і дзіцячым асартымэнтам тавараў. Асабліва мала бывае жаночага і дзіцячага абутку.

Для паляпшэньня работы сталоўкі агульны сход работніц вылучыў 5 лепшых ударніц—буфэтчыцу, кухарку і афіцыянтак.

Работніца.

Шклоў.

МІЖНАРОДНАЯ СТАРОНКА

(Ліст палітзьняволеных жанчын катаржнай турмы Фардон да рабочых і сялян Заходняй Беларусі)

Таварышы рабочыя і сяляне Заходняй Беларусі!

Мы, палітвязьні, зварачаемся з-за кратаў Фардонскай жаночай турмы да вас, нашых родных бацькоў і братоў.

Загнаў нас у турму фашызм за тое, што мы разам з вамі вялі барацьбу супроць акупанцкай фашысцкай няволі, за вызваленьне Заходняй Беларусі, за тое, што мы змагаліся за працу і зямлю, за хлеб і волю, за ўласную сваю ўладу, уладу рабочых і сялян.

Мы змагаліся ня гледзячы на шалёны фашысцкі тэрор. Калі нас катавалі ў дэфэнзыве, мы гэта перанесьлі і засталіся моцнымі духам. Не спалохаліся мы і тады, калі фашысцкі суд пазасуджваў нас на 8–10—15 гадоў.

Мы прасядзелі за кратамі па 4, 5, 7 гадоў кожная. Нас выслалі з Заходняй Беларусі аж на нямецкую мяжу ў Фардон, каб трымаць нас далей ад вас, ад вашай барацьбы, каб адарваць нас ад яе. Але і туг, у гэтай польскай ссылцы, і пасьля шмат гадоў, пражытых у турме, нашы думкі і ўсё наша жыцьцё поўны супольнай з вамі барацьбы. Мы з вамі, таварышы!

Фашысты не здавальняюцца тым, што пазбавілі нас волі, яны хочуць замарыць нас голадам і холадам. Ежа з кожным днём пагоршваецца. У зупе бульбіны ня знойдзеш, але за тое знойдзеш шмат чарвей. Мы галадаем. У камэрах, дзе мы сядзім, холадна і вільготна, на сьценах часта цячэ вада, а як вялікі мароз на дварэ, тады вада ў камэрах на сьцяне і ў вёдрах замярзае. У нас амаль зусім ня паляць. Мы замярзаем.

У нас рукі і ногі паадмарожваны. Некаторыя таварышкі папухлі і пакрыліся ранамі. На нашы дамаганьні турэмная адміністрацыя дае адзін адказ: „Цяпер трэба праводзіць ашчаднасьць". На атрутныя газы, на гумовыя палкі, на кулямёты і самалёты, каб душыць рэвалюцыйна-вызваленчы рух на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, каб душыць рэвалюцыйную барацьбу польскага пралетарыяту, каб распачаць вайну супроць Савецкага саюзу,—на гэта яны грошы маюць. Але на лекі для палітвязьняў, якіх яны зрабілі калекамі і хворымі, дык няма. У нас шмат хворых на сухоты, сэрца, хворых на страўнік і іншыя хваробы, а лячыць нашых таварышоў ня хочуць. Год таму назад памерла ў нас тутака тав. Канапава, бо яе не лячылі і ня пусьцілі на волю нават перад сьмерцю. Мы хочам, каб вы ўсе ведалі аб ёй, бо яна змагалася і памёрла за нашу справу. Таварышка Кацярына Канапава – работніца хэмічнай фабрыкі ў Кракаве—больш 30 год вяла рэвалюцыйную працу. У 1923 годзе яна прымала актыўны ўдзел у паўстаньні рабочых Кракава. У турме прасядзела 7 гадоў, апошні год ужо зусім прыкавана да ложка. Яна памёрла замучаная фашыстамі. Але наша барацьба ідзе без перапынку. Дапамажэце нам у ёй!

Таварышкі работніцы і сялянкі! Да вас мы зварачаемся з асабліва палкім рэвалюцыйным заклікам. Для вас у нас тысячы бадзёрых, ласкавых слоў. Мы ведаем аб вашых бедах, мы ведаем, як вам цяжка, як вас цісьне акупанцкая фашысцкая няволя. Мы ведаем, што ўжо цэлыя тысячы вас змагаюцца супроць гэтай няволі. Даражэнькія вы нашы, роднень-кія! На месца замучанай тав. Канапавай прыдуць новыя тысячы вас, работніц і сялянак, стануць да рэвалюцыйнай барацьбы, якою кіруе камуністычная партыя, да барацьбы за працу і зямлю, за вызваленьне Заходняй Беларусі, за савецкі рабоча-сялянскі ўрад.

Фашысты хочуць нас ня толькі зьнішчыць фізычна, але і зламаць духоўна. Мала таго, што яны даюць нам кепскую ежу і гэтым прымушаюць галадаць, яны яшчэ не даюць нам і дзяліцца паміж сабой тымі харчамі, якія нам часам прысылаюць з астатняга бацькі. Фашысты ня хочуць, каб мы самі нават дапамагалі нашым хворым, ня хочуць, каб мы жылі так арганізавана і дружна, як мы жывем заўсёды, не дапушчаюць у турму патрэбных кніжак, зусім не даюць беларускіх кніжак, газэт. Не даюць нам пісаць лісты да нашых бацькоў на роднай нашай мове—па-беларуску. Патрабуюць пісаць толькі па-польску. Фашысты гэтым праводзяць тую самую акупанцкую палітыку, якую праводзяць у вас на Заходняй Беларусі. Мы добра ведаем, што вы там супроць гэтага змагаецеся. Мы хочам змаганьня. Мы—з вамі. Ведайце аб тым, што і мы тут бязупынна вядзем барацьбу супроць польскага фашызму. Далёка загналі нас ад вас і ня лёгка нам падаць свой голас з турмы, каб яго за тысячу кілёмэтраў, якія ляжаць паміж намі, пачулі. Але тутэйшыя рабочыя і сяляне ўжо ня раз чулі аб нашых рэвалюцыйных дэманстрацыях за мурамі турмы. А калі мы вядзем барацьбу, то нас за тое фашызм карае: нас кідаюць у „карцар", трымаюць у „карцары" без яды, без паветра. Але, ня гледзячы на гэтыя „кары", ні на адну хвіліну не заціхае ў нас змагарскі дух. Мы не аддамо без барацьбы ні аднаго свайго права. Але нам патрэбна ваша дапамога. Таварышы рабочыя і сяляне! Памятайце аб нас. Абараняйце нас ад фашысцкага турэмнага рэгляманту. На кожным сходзе, пасяджэньні, на кожнай фабрыцы, у кожнай вёсцы пратэстуйце супроць катаваньня палітвязьняў. Не давайце замарыць нас голадам. Дамагайцеся, каб фашысцкі ўрад зьняў гэты рэгламант і ваенна-палявыя суды. Дамагайцеся вызваленьня палітвязьняў. Толькі вы сваёй напружанай рэвалюцыйнай барацьбой адчыніце нам брамы, толькі вы дасьцё нам волю, магчымасьць змаганьня зноў у вашых рэвалюцыйных радох.

Мы шлем вам наша палкае рэвалюцыйнае прывітаньне, поўнае салідарнасьці з вамі і радасьці за посьпехі вашай нераможнай барацьбы. Мы пэўны, мы цьвёрда верым і спадзяемся, што блізка ўжо сяветлы дзень рэвалюцыі ў Польшчы.

Няхай жыве рэвалюцыйна-вызваленчая барацьба рабочых і сялян Заходняй Беларусі з пралетарыятам усёй Польшчы пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі Германіі.

Палітычныя вязьні жаночай катаргі Фардон.

Беспрацоўная сям'я, выкінутая з кватэры дамаўласьнікам (Лёндан, Англія).

Работніцы і працоўныя сялянкі!
Пад сьцягам Камінтэрна—
на барацьбу супроць фашысцкага тэрору!

З. Бандарына.

Першы Май

Навэля

(Працяг)

Дзіцёнак... Так, гэты прадавец „Ротэ Фанэ“ нават у мяне абудзіў забытую рамантыку юнацтва, гуманістычныя прынцыпы далёкага юнацтва...

Прафэсар пяшчотна па-бацькаўску гладзіў бялявую галаву сваёй выхаванкі.

— Лэйтэнант Вэрдж?! Пыталіся вы ў мяне раней. Але трэба ўлічваць—ён толькі выканаўца і сумленна выконвае свае абавязкі. Ён—службоўца. Вы плачаце, Эльза?! О, гэтыя нэрвы! Я катэгарычна забараняю вам ісьці заўтра ў клініку! Вы запрацаваліся. Арганізм патрабуе перадышкі. Гэты месяц вы будзеце жыць на дачы, гуляць у тэніс, кракет, захапляцца прыродай.

Чуеце, я сам прывязу да вас маладых людзей, каб, урэшце, на месяц зрабіць вас бесклапотнай цікавай і зусім натуральнай жанчынай.

Я вінаваты сам, што занадта эгаістычна, аднабока падыходзіў да вашага разьвіцьця, вымагаючы хутчэй асвоіць мае веды і вопыт. Вы былі маёй лепшай студэнткай. Урэшце, пасьля сьмерці майго сябра і вашага бацькі, я зрабіўся вашым апякуном. Вы замянілі мне дачку і сябра і я зноў паўтараю—палітыка не для нас. Толькі навука здольна кіраваць сусьветам, перажываючы ўсе дзяржаўныя і палітычныя ўклады.

Эльза, заўтра я адвязу вас, на дачу...

Шпіталь.

Хірургічнае аддзяленьне...

— Там напісана выразна. З сёнешняга дня мы ня маем права прымаць чырвоных франтавікоў, камуністаў і беспрацоўных...

— Але ў мэдыцыне няма палітыкі, няма партыі, у нас ёсьць толькі хворыя, якіх мы мусім ратаваць.

У нас—свая этыка...

— З сёнешняга дня...

— Фрэйлін Эльза!!. Адмовілася?. Не, яна—хворая, я сам забараніў ёй прыходзіць у клініку...

— Мы заўважвалі...

— Вы памыліліся, яна ніколі не займалася палітыкай.

— Ва ўсякім разе...

— Гэты месяц яна будзе адпачываць на дачы і паменш думаць пра шпіталь...

— Час патрабуе інакшага...

— Я адказваю за яе здароўе...

За тыдзень рыбацкімі сецямі зрабілася неба, дзень і ноч ішоў дробны дождж.

Да забастовачнага камітэту падыйшла добра апранутая жанчына. На вуліцах выраставалі барыкады.

— Я хірург і не магу больш заставацца нэйтральнай,—проста сказала незнаёмая жанчына кіраўніку чырвонай абароны.

Дні!!

У мяцежнай завірусе не разгледзіш дзён. Маномэтр паказваў найвышэйшую хуткасьць. Стрэлка гадзіньніка бесьперапынна бегла па цыфэрбляту высьцігаючы зьмены.

Рванула маятнік...

— Бмммм... Звонам забумкаў час...

У партыйным камітэце ішла нарада, камфракцыя вызначыла Эльзу дакладчыкам.

Па ўзьлеску красавалі лілёвыя фіялкі. Чмуціў востры п'янаваты водыр. Зьбіралася першамайская маёўка. Усхваляваная апавядала Эльза пра шпіталь, беспрацоўных, параненых ды забітых штурмавікамі, урэшце пра малога Вілі, пра загад прэзыдэнта і пра тое, як яна прыйшла да камуністаў...

Ціха, уважліва слухаў натоўп.

На ўзлеску красавалі лілёвыя фіялкі.

Не пазнаць, адкуль выросла трывога.

Кінэматографам—конны атрад палісмэнаў,

штурмавікі...

паніка...

Боль у галаве...

Пасьля перад вачыма на кані постаць лейтэнанта Вэрджа.

— Эльза!?.

Да старой хвоі прытулілася дзяўчына ў белай сукенцы, у яе за карсажам цьвілі фіялкі, рука там-жа намацала маленькі браўнінг...

Саскочыўшы з каня, сьпяшаецца да яе лэйтэнант Вэрдж:

— Я нічога не разумею, Эльза?!—

...Гук нявыразны ў наваколь-ным .гуле, зьвярыны жах у пашыраных зрэнках Вэрджа, дым сінявата шэрым павуціньнем і яснасьць, нязвычайная яснасьць у галаве Эльзы.

Арыштаваных гналі ў паліцыю. Ярка перад вачыма сьвяціла сонца. Высока нырцуючы у блакіце, дражніцца капрызным маем жаўранак.

Першае мая! Пошчакам ляціць па глухіх завулках сутарэньнях, рабочых кварталах...

Першае мая! Нечакана крычыць сустрэчны радыё-рупар.

На павароце...

Адзін за адным выехалі на шашу грузавікі пад чырвонымі сьцягамі.

— Рот фронт!—гукнуў высокі хлапец ў юнгштурме.

Рот фронт!—голасна адказала яму Эльза.

(Канец).

Па сьлядох заметак

Па матар'ялах селькораў выкрыта ў калгасе „Чырвоная зорка" (Любаньскі раён) група антысэмітаў, якая цкавала і зьдзекавалася над актывісткай-калгасьніцай яўрэйкай Гэлькай Элевіч.

Гэта справа на аснове паступіўшых селькораўскіх матар'ялаў была падрабязна расьсьледавана спэцыяльна вылучанай камісіяй разам з прадстаўніком ЦК КП(б)Б. Факты, указаныя ў матар'ялах селькораў, у аснoўным пацьвердзіліся. Вынікі расьсьледаваньня былі заслуханы на бюро РК.

Бюро райкому правільна расцаніла гэты факт, як вылазку клясавага ворага, што сакратар партячэйкі Савельлеў і старшыня калгасу „Чырвоная зорка" тав. Сазонаў праявілі палітычную сьлепату і самі зьяўляліся галоўнымі носьбітамі антысэмітызму.

Бюро РК абавязала агітмаса аказаць дапамогу Тальскай партячэйцы, якая абслугоўвае калгас „Чырвоная зорка", у разгортваньні шырокай масавай работы вакол пытаньня ленінскай нацыянальнай палітыкі. Калгасьнік Сушчык Кірэй, Сазонаў—старшыня калгасу і Савельлеў—сакратар ячэйкі выключаны з радоў партыі і адданы пад суд.

РК прапанаваў РВК зьняць з працы антысэміта Лутовіча Фёдара і вывесьці са складу прэзыдыуму сельсавету антысэміта Лутовіча Алеся і зрабіць паказальны суд у вёсцы Таль над антысэмітамі.

РК ЛКСМБ прапанавана выслаць спэцыяльную брыгаду ў Тальскі сельсавет для наладжаньня камсамольскай работы.

РК прапанаваў прапрацаваць пастанову аб справе Гэлькі Элевіч з калгасу „Чырвоная зорка" на ўсіх адкрытых партыйных сходах раёну і асьвятліць гэта пытаньне ў раённым друку.

Ворагі—антысэміты атрымалі па заслугах.

* * *

На заметку „Неадкладна наладзіць работу завёртачных машын", надрукаваную ў № 10 часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі", загадчык вытворчасьці фабрыкі „Камунарка" паведамляе, што ўжо працуюць пяць завёртачных машынак. У бліжэйшы час будуць працаваць усе машыны.

* * *

У нумары 8 часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі" быў надрукован ліст тэхнічкі школы калгасу „Прыазёрны", Асьвейскага раёну, т. Міхно аб тым, што за паўтары гады яе работы яна атрымала зарплаты ўсяго 30 руб.

Асьвейская пракуратура паведамляе, што факты, прыведзеныя ў лісьце, цалкам пацьвердзіліся, і тав. Міхно ўжо атрымала зарплату за ўвесь час работы.

* * *

На заметку „Адкрыць ясьлі ў Капылі—вызваліць для вытворчай працы шмат рабочых рук", надрукаваную ў часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі" за № 34 1932 г., Капыльскі райздраў і райза паведамляюць, што ў Капылі будуць адкрыты ясьлі, ужо набыт ясельны інвэнтар.

* * *

Допіс „Прыцягнуць Цімошкіну да адказнасьці" быў намі накіраван у гомельскую раймілiцыю, якая паведамляе, што Цімошкіна Насьця прыцягваецца да судовай адказнасьці за раскрадваньне проса, ільну ў калгасе „Чырвоны бераг", Карналінскага сельсавету, Гомельскага раёну.

* * *

На заметку аб тым, што доктар Семежаўскай амбуляторыі, Чырвона-Слабодзкага раёну, Балванoвіч бярэ ў сялянак хабары, Чырвона-Слабодзкая РКК РСІ паведамляе, што гэта справа накіравана сьледчым органам.

* * *

У № 2 нашай часопісі была надрукавана заметка пад назвай: „Перараджэнцам—сабатажнікам загатовак ня месца ў органах дыктатуры пралетарыяту".

Шклоўская РКК-РСІ паведамляе, што факты цалкам пацьвердзіліся. Старшыня Чарнянскага сельсавету Шакуро Васіль пастановай прэзыдыуму РКК КП(б)Б зьнят з работы і выключан з партыі. Сакратару партячэйкі Зайцаву абвешчана суровая вымова і ён зьнят з пасады сакратара ячэйкі з забаронай на працягу году працаваць на адказнай партыйнай і савецкай рабоце.

* * *

Заметка „Зьнішчыць антысанітарыю ў малочным заводзе Якаўлевіцкага сельспажыўтаварыства" была накіравана на расьсьледваньне ў Аршанскую РКК-РСІ, якая паведамляе, што факты аб антысанітарным становішчы малочнага заводу пацьвердзіліся, факты-ж аб разбазарваньні малочных прадуктаў і ашуканьне здатчыкаў малака, аб якіх таксама гаворыцца ў заметцы, расьсьледваньнем не ўстаноўлены.

Аршанская РКК-РСІ прапанавала райспажыўсаюзу і якаўлевіцкаму сельспажыўтаварыству прыняць тэрміновыя меры да зьнішчэньня ненармальнасьцяй у рабоце малочнага заводу і аб замене кіраўніцтва заводу і прыцягненьні да адказнасьці вінаватых.

* * *

На заметку „П'яніца" Менскі райземаддзел паведамляе, што за п'янства тав. Герасімовіч зьнят з работы загадчыка складу калгасу імя Дзяржынскага і па партлініі атрымаў спагнаньне.

* * *

На заметку „Буржуазнаму перараджэнцу няма месца ў радох партыі" Любаньская РКК-РСІ паведамляе, што факты ў допісе пацьвердзіліся. Сеўрук А. С. выключан з партыі і матар'ял аб ім перадан сьледчым органам.

КОШТ АСОБНАГА НУМАРУ 10 КАП.

698

Парады агранома

ЯКОГА ДОГЛЯДУ ПАТРАБУЕ КАПУСТА

Ад 30 да 40 проц. усёй гародняй плошчы БССР прыходзіцца пад капусту. Ня гледзячы на гэта, многія яшчэ ня ведаюць, як атрымаць добры яе ўраджай.

Для атрыманьня добрага ўраджаю капусты трэба яе ўважліва даглядаць. Капусту трэба адрозьніваць—раньнюю, сярэднюю і позьнюю.

Раньняя капуста дае качан праз 100 дзён пасьля пасеву, або праз 2 месяцы пасьля высадкі рассады.

Капуста сярэдніх гатункаў пасьпявае праз 3 месяцы пасьля высадкі рассады,

З позьніх гатункаў капусты трэба адзначыць „Брауншвэйскую", „Беларускую" і „Амагер"—якія зьяўляюцца лепшымі для Беларусі. „Амагер" добра захоўваецца на працягу зімы.

„Брауншвэйская" і „Беларуская" капуста пасьпяваюць праз $3^1/_2$—4 месяцы, „Амагер"—праз $4^1/_2$ месяцы пасьля высадкі рассады. Капуста патрабуе багатай арганічнымі ўгнаеньнямі глебы.

Вучастак павінен быць добра забясьпечан вільгаццю. Глебу для капусты трэба ўгнаіць гноем, торфам або кампоснымі адкідамі ў колькасьці ад 40 да 60 *т* на *га*, або палову гною замяніць мінэральнымі ўгнаеньнямі. Гной неабходна ўносіць з восені, сільвініт раньняй вясной пад першае баранаваньне, супэрфасфат і серка-кіслы амоні пад апошняе ворыва або баранаваньне.

Кіслыя глебы спрыяюць разьвіццю хваробы „капуснай кілы". Таму ў такія глебы трэба ўнесьці 2 тоны вапны на 1 *га*.

З восені трэба пад капусту заараць глебу як мага глыбей, вясной у першую чаргу заараць і прабаранаваць вучастак, вызначаны пад раньнюю капусту, потым пад позьнюю і ў апошнюю чаргу—пад сярэднюю.

Пасьля апошняга баранаваньня поле разьмяркоўваецца на адлегласьці—60×60 ст. для раньняй, 70×70 ст. для сярэдняй і 90×90 ст. для позьніх гатункаў капусты.

Усяго на *га* патрэбна рассады 28.000 шт. раньняй, сярэдняй—21.000 шт. і позьняй—12.500 шт. На падсадку трэба дабавіць рассады каля 10 проц.

Уноў пабудаваны амбар у калгасе імя Карла Маркса, Касьцюковіцкага раёну.

Пасадку робяць у ямку пад рыдлёўку, пад савок і пад матыку, або саджальнай машынай.

Лепш за усё ідзе пасадка наступным чынам. Брыгада—з 30 чалавек. 3-х чалавек вызначаюць на выбарку рассады і падвозку на вучастак. Яны адказваюць за якасьць рассады і ведаюць яе ўлікам. 3 чалавекі разносяць рассаду да саджальшчыц або раскідваюць каля лунак па 12.000 шт. кожная, 3 чалавекі робяць лункі матыкамі або ямку рыдлёўкай па метках маркера. 7 чалавек садзяць рассаду ў гатовыя лункі—яны адказваюць за якасьць прыжытай рассады, 4 чалавекі на 3 конях подвозяць ваду, пры гэтым адзін з іх дапамагае наліваць ваду ў бочкі і перакочвае бочкі з кварталу на квартал.

3 чалавекі падносяць ваду ў 2-х лейках паліваль шчыцам і 3 чалавекі паліваюць з разьліку $^1/_2$ літра вады на рассаду.

3 чалавекі прысыпаюць лункі сухой глебай, каб затрымаць вільгаць ад паліўкі.

Такая брыгада можа высадзіць ад 2,0 да 2,35 *га* сярэдняй рассады за рабочы дзень.

Праз два-тры тыдні пасьля пасадкі зьяўляецца бялянка, якая адкладвае галоўным чынам на ніжняй старонцы лісты жоўценькія яйкі па 50—100 шт. у кучы. З іх выходзяць чарвячкі, якія прагрызаюць ліст і гэтым зьмяншаюць ураджай капусты.

З мер барацьбы трэба адзначыць: у часе лёту бялянкі—рукамі душыць кучкі яек.

Пасыпаць капусту па расе попелам, вапнай або тутунёвым пылам праз распыліцелі ці рукамі.

Папырскаць капусту мешанінай парыскай зелені з разьліку 1 *г* на літар вады. Ад гэтай атруты чэрві гінуць.

Ня трэба апырскваньне рабіць у апошнія 3 тыдні росту, каб не атруціць капустай насельніцтва.

Праз месяц пасьля пасадкі трэба капусту акучваць. Акучваньне дае магчымасьць атрымаць на пяньку новыя карэньні, якія паляпшаюць рост капусты. Акучваньне трэба рабіць пасьля дажджу, калі зельле знаходзіцца пад прыпаркам—ад сухой зямлі капуста псуецца.

Праз 3—7 тыдняў пасьля першага акучваньня яно зноў паўтараецца.

Аграном Л. Калер

Завербавалі 60 падпісчыц

Слаўнаўскі дэлегацкі пункт вылучыў чатырох дэлегатак для правядзеньня падпіскі на часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі". Вылучаны т. т. Мэтрык Маша, Кляшчонак Насьця, Глікман і Лакамец.

Брыгада завербавала 60 падпісчыц на трохмесячны тэрмін і ўзяла на сябе абавязак у далейшым распаўсюджваць часопісь па калгасах і вёсках.

Мэтрык.

Талачынскі раён.

Выданьне ЦК КП(б)Б. Рэдактар Э. Шапіра.

16 Друкарня імя Сталіна. Зак. № 1289 У ліку 2.500 экз. Менгарліт № 1416.